# Адкрыць і падтрымаць

## V рэспубліканскі конкурс харэаграфічнага мастацтва "Дэнс-кангрэс" стартаваў у Мінску.



Пляцоўкай для творчага дыялогу, сцэнічных адкрыццяў і прафесійнага росту з 23 па 25 красавіка стала канцэртная зала спартыўна-культурнага цэнтра Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Танцавальны форум, арганізатарамі якога з'яўляюцца Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і БДУКМ, скіраваны на развіццё патэнцыялу таленавітай моладзі, удасканаленне майстэрства маладых выканаўцаў і пашырэнне інтарэсу да розных напрамкаў харэаграфіі.

Удзельнікі прадстаўляюць нумары ў дзвюх намінацыях — "Сучасны танец" (катэгорыі "Сола", "Дуэт", "Калектыў") і "Беларускі танец: традыцыя і навацыя" ("Калектыў"). У катэгорыях "Сола" і "Дуэт" першую ўзроставую групу складаюць хлопцы і дзяўчаты 10—15 гадоў, другую — 16—21 года. У катэгорыі "Калектыў" — артысты 9—15 і 16—31 года адпаведна.

Ацэньваюць падрыхтоўку вядомыя дзеячы харэаграфічнага мастацтва Беларусі і замежжа.

Акрамя конкурсных праглядаў, у праграме — паказы тэатралізаваных праектаў, майстар-класы педагогаў БДУКМ, сустрэчы з прадстаўнікамі ўстаноў мастацкай адукацыі, дзе абмяркуюць актуальныя пытанні развіцця галіны.

Па выніках спаборніцтва вызначаць пераможцаў у кожнай намінацыі і катэгорыі, а таксама ўладальнікаў гран-пры і спецыяльных узнагарод, у тым ліку за найлепшую балетмайстарскую работу. Наперадзе — яркія выступленні, новыя імёны і жывыя эмоцыі.